УДК 947.6(04) «18/19» Немцевич

*Анатоль Гладышчук, загадчык кафедры фізікі Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта, кандыдат фіз.-мат. навук; г. Брэст, РБ.*

## БЕРАСЦЕЙСКАЯ АДМЕТНАЯ СПАДЧЫНА НЯМЦЭВІЧАЎ

«Нарадзіўся я 16 лютага 1758 года ў Скоках над ракою Лясною, у маёнтку на адлегласці вялікай мілі ад Брэста Літоўскага, ад Марцэля Ўрсын Нямцэвіча і Ядвігі з Сухадольскіх. Дзед мой, Аляксандр Нямцэвіч, адпісаў вёску гэтую бацьку майму, сам заставаўся жыць у Клейніках. Я памятаю скокаўскі дом, дзе свет я ўбачыў, – невялікі, драўляны, з лістоўніцы, сёння ён ужо разабраны», – так запіша аб месцы і часе свайго нараджэння наш знакаміты зямляк, 250-годдзе нараджэння якога мы святкуем у

гэтым годзе, Юльян Урсын Нямцэвіч. Гэтае месца доўгі час заставалася не вызначанным і памылкова лічылася, што стары драўляны дом Нямцэвічаў стаяў каля пабудаванага пазней каменнага палаца ў Скоках.

Калона на Рахвале. Кожны, хто бываў у ваколіцах Скокаў, не мог не заўважыць прыкметнай цаглянай калоны, вышынёй метраў з сем. Такі класічны стройны круглы слуп, дыяметрам больш за метр, з чатырма нішамі, арыентаванымі па баках свету, на пануючым узвышшы над далінай ракі Лясной, з якога ў яснае надвор'е добра відаць і само Берасце. Доўгі час прызначэнне самой калоны заставалася неакрэсляным. Вядомыя крыніцы на гэты конт адназначнага адказу таксама не давалі. Ключом да адказу на гэта пытанне з'явілася загадкавая назва мясцовасці, дзе стаіць калона – **Рахвал**. З'езд Нямцэвічаў у маі 2002 года ў Берасце даў выніковы штуршок гэтаму даследванню, таму што Тэрэса Верыха з Урсын Нямцэвічаў, якая ў 1925 годзе нарадзілася ў Скоках, прывезла на гэты з'езд для сваіх блізкіх кампутарны варыянт успамінаў свайго бацькі Станіслава Ўрсын Нямцэвіча, які быў апошнім гаспадаром у Скоках. У хуткім часе пошта даставіла ў Скокі бандэроль з Польшчы, у якой быў рукапіс Станіслава Ўрсын Нямцэвіча «Маім унукам». Манускрыпт выпадкова раскрыўся на пятай старонцы. У вочы кінуліся перадапошнія радкі: «Ён [Марцэлі Ўрсын Нямцэвіч, – аўт.] **таксама паставіў на высокім слупе статую святому Рафалу, які стаяў непадалёку ад дворыка, і слуп гэты без статуі заставаўся да апошняга часу...»**

Усё адразу стала зразумела! Дык вось адкуль паходзіць назва мясцовасці Рахвал – ад драўлянай статуэткі архаанёла Рафаіла, на польскай мове гэтае імя гучыць як Рафал, а ўжо на нашым мясцовым дыялекце – як Рахвал, таму што літара «ф» у мясцовым гучанні перадаецца гукам «хв». Такім чынам, захаваная назва мясцовасці вярнула гістарычную праўду – дом і месца, у якім нарадзіўся наш знакаміты зямляк Юльян Урсын Нямцэвіч, знаходзіліся на Рахвале каля Скокаў, дзе і жылі Нямцэвічы да таго, як пабудавалі каменны палац у саміх Скоках. А высвятленне сапраўднага прызначэння цаглянай калоны архаанёлу Рафаілу – рэдкага помніка дойлідства – дае магчымасць заняць

ёй годнае месца ў рэестры помнікаў гістарычнай спадчыны нашай дзяржавы.

Звернемся зноў да «Успамінаў...» Юльяна Ў. Н.: «З усялякай журботай і засмучэннямі гэтага жыцця звярталіся мы са шчырай верай да іконы Маці Божай Вістычскай. Аднойчы я, яшчэ малы, даволі небяспечна захварэў воспай. Не ведалі яшчэ ў той час вакцыны ад воспы. Хвароба была моцная і небяспечная. Трымалі мяне ў празмерна цёплым памяшканні. Памятаю, што быў у гарачцы і трызніў. Перапалоханыя мае бацькі акрамя дапамогі спадара Мюлера, доктара падскарбія Флемінга з Тэрэспаля, звярнуліся да Бога. Ахвяравалі мяне да цудоўнага абразу Маці Божай у Вістычах...» Гэта дае нейкую падставу меркаваць, што і цагляная калона ў Вістычах у гонар Маці Божай магла быць узведзенна таксама Марцэлем Урсын Нямцэвічам – бацькам Юльяна, але, нажаль, прамых доказаў гэтаму пакуль не знойдзена.

**Капліца Марыі Егіпецкай.** Як і ў справе папярэдняй, ключом для вызначэння месца, дзе знаходзілася капліца, з'явілася назва мясцовасці – **Яскіня**. Дык вось! Калі цяпер ад цаглянай калоны арханёлу Рафаілу, якую ўзнёс каля свайго старога двара на Рахвале каля Скокаў Марцэлі Ўрсын Нямцэвіч з нагоды нейкай высокай духоўнай патрэбы ў 1770-х гадах, кіравацца ў напрамку старога матыкальскага гасцінца на поўдзень, то праз паўкіламетра нельга не заўважыць лагчыну, якая ідзе ад узвышша злева праз стары гасцінец і шырокім распасцёртым паглыбленнем упіраецца ў чыгунку. Няма сумнення, што ў старыя даўнія часы па гэтай лагчыне вада з наваколля ў часы паводкі і даждлівыя леты збягала да ракі Лясной. Гэта месца і завецца Яскіняй.

У сваім манускрыпце «Маім унукам» Станіслаў Урсын Нямцэвія паведаў наступную гісторыю: «...Пра гэтыя «гроты» ў дубовым ляску няма адназначнага меркавання, і ніхто нават у тыя часы ўжо не памятаў, як яны тут з'явіліся. Гэта былі два цагляныя купалы, моцна прысыпаныя зямлёю, якія больш нагадвалі невялікія земляныя курганы. У адным з іх была зроблена нават печка. Абодва купалы былі абнесены глыбокімі равамі, а перад уваходам да іх уздымалася цагляная сцяна вышынёю каля метра, якая як бы абараняла гэтае месца. Мясцовая легенда

сцвярджала, што некалі адзін з Нямцэвічаў самотна жыў там і каяўся ў грахах, а таксама лячыў ад нейкіх хвароб людзей, якія да яго прыходзілі, і вёў богабаязнае жыццё. Гаварылі, што ў час паўстання 1830 года там быў невялікі «рэдут» са складам зброі і боепрыпасаў для паўстанцаў...»

Аб якіх гротах каля Скокаў мог апавядаць Станіслаў У. Н.? Аказваецца яскіня на польскай мове гэта і ёсць грот і размова ідзе менавіта аб гэтым месцы. У 1770-я гг., яшчэ да будаўніцтва каменнага палаца ў Скоках, Марцэлі, верагодна, пранікся вялікімі духоўнымі каштоўнасцямі да апавядання святога Зосіма аб Марыі Егіпецкай, і пабудаваў у гэтай лагчыне, непадалёку ад свайго дома, капліцу Марыі Егіпецкай, аб чым адназначна згадвае яго сын, Юльян. Незвычайнае месца, выбранае для яе будаўніцтва, становіцца зразумелым, калі пазнаёміцца з апісаннем жыцця святой Марыі Егіпецкай. Што да назвы месца – Яскіня, то так на польскай мове гучыць слова «пячора» альбо «грот», на якія вельмі паказвала, пабудаваная Марцэлем капліца. Адтуль і назва гэтага месца, што захавалася дагэтуль. Што да двух купалаў у лагчыне, то можна спраўдзіць здагадку, што такая архітэктурная форма магла сімвалізаваць сустрэчу каля русла высахлага ручая двух святых – Зосіма і Марыі Егіпецкай. Праваслаўная царква ўстанавіла ў Вялікі пост, у чацвер пятай седміцы, успамінаць жыццё святой Марыі Егіпецкай (Марыіна стаянне). Каталіцкая царква таксама з павагаю адносіцца да гэтай святой.

Якога б погляду на пачутую гісторыю кожны з нас не прытрымліваўся б, але фактам застаецца гістарычная спадчына двух месцаў, Рахвала і Яскіні, якія з'яўляюцца помнікамі той эпохі, таго часу, тых звычаяў, але належаць нашай нацыянальнай гісторыі, ад якой адхрысціцца ніяк нельга. Без спакусы на новыя звычаі, захаваем тое, што мела ў свой час зямля наша прыбужская. Няхай гэта дапаможа прымножыць ёй сваё культурна-духоўнае багацце.

<u>Лявошкі... Нэплі... Клейнікі... Скокі.</u> Нечаканна ў гербоўніку К. Нясецкага знаходзім, што Самуіл Казімір Урсын Нямцэвіч фундаваў алтар Св. Казіміра картэзіанцам, што ў Бярозе Картузкай на Берасцейшчыне, і меў непадалёку ад кляштара ўласную маёмасць Лявошкі, дзе, верагодна, заставаўся жыць, таму што ў сваім тастаменце загадаў сабе пахаваць менавіта там,

у кляштары картэзіанцаў і маёмасць сваю – Лявошкі – адпісаў да картэзіанцаў. Такім чынам, высвятляецца зусім невядомы факт, што Лявошкі каля Бярозы Картузскай належалі ў другой палове XVII стагоддзя Нямцэвічам. К.Нясецкі, які мог уласна бачыць надмагільную пліту Самуіла Нямцэвіча ў бярозаўскіх картэціанцаў, мусіць, не памыляецца, таму што паведамляе пра гэта дэталёва. Вось як ён піша: «...сам загадаў у картузаў сябе пахаваць, дзе ляжыць з надгробкам і партрэтам сваім, на якім моліцца перад распяццем, з такім надпісам:

**Д.О.М.**

***Quod sum, Lector eris, quid eris, quaeris .?. morieris,***
***Nolis, sive velis, putre cadaver eris.***

Пад гэтымі вершамі справа змешчаны герб «Равіч» з літарамі ўнізе, пасярэдзіне знаходзіцца згаданы партрэт, пад ім выявы зброі і іншых вайсковых знакаў, злева ад партрэта наступныя словы:

***Ecce Samuel Casimirus Niemcewicz, Dapifer Wilkomiriensis, in hoc angulo, cum perenni hebdomadario Sacrificio votivo, sisto; tu qui pertransis memento, obsecro. Exarui aetatis meae...*** *(далей нельга прачытаць).*

**Anno Salutis MDCLXXIII. die 6. Augusti.**

Адсюль дакладная дата смерці Самуіла Казіміра – 6 жніўня 1673 года. Гэта першы датаваны след Нямцэвічаў на Берасцейскай зямлі, таму можна меркаваць, што нейкі кароткі час Лявошкі маглі з'яўляцца іх радзінным гняздом. Аб гэтым паведамляе таксама ў «Гістарычных падарожжах» Юльян Урсын Нямцэвіч.

Сын Самуіла Казіміра Андрэй ужо перамесціўся пад Берасце ў Нэплі на Бузе, у сваю чаргу яго сын Аляксандр, дзядуля Юльяна, далучыў да гэтай маёмасці Клейнікі на Лясной і Скокі, а бацька Юльяна Марцэлі зрабіў Скокі радзінным гняздом Нямцэвічаў.

**Скокаўскі замачак** Аляксандр Урсын Нямцэвіч (VII генерацыя) сваю немалую маёмасць, згодна тастаменту, паздзяліў у асноўным паміж двума сваімі сынамі: старэйшаму Францішку аддаў Нэплі, а малодшаму Марцэлю – Клейнікі і Скокі, і да смерці сваёй жыў па паўгода то ў аднаго, то ў другога сына. Два другія яго сыны – Ігнацій і Крыштаф – заставаліся нежанатымі, а яшчэ адзін – Міхал – стаў смаленскім канонікам.

Скокі здаўна з'яўляліся шляхецкім маёнткам. Першае дакладнае ўпамінанне іх адносіцца да 1550 года, калі праводзілася валочная памера каралеўскай маёмасці. Тады яны належалі Сямёну Багдановічу Клуйводзе, а затым адышлі, праўдападобна, яго нашчадку Фёдару Скокаўскаму і ў 1589 годзе ўжо з'яўляліся ўласнасцю мужа і жонкі Заранка Гарбоўскага і Марыны Скокаўскай. У другой палове XVII стагоддзя Скокі сталі ўласнасцю князёў Шуйскіх, з якімі да гэтага часу Нямцэвічы ўжо парадніліся. Можа, менавіта гэтае сваяцтва і дапамагло Аляксандру далучыць Скокі да сваіх валоданняў, якія з другой паловы XVIII стагоддзя больш як на паўтара стагоддзя становяцца радзінным гняздом Нямцэвічаў.

Прадаўжальнікам роду Нямцэвічаў у VIII генерацыі стаў Марцэлі Ўрсын Нямцэвіч, дваранін Я.К.М., падчашы Мельніцкі, які ўзяў шлюб з Ядвігай з Сухадольскіх. Гэта была па тым часе вельмі ўзорная сям'я. Ядвіга, маці Юльяна Ўрсын Нямцэвіча, нарадзіла ажно шаснаццаць дзяцей. Праўда, дарослымі сталі толькі сямёра: трое сыноў і чацвёра дочак. Можа ад таго, што дзеці так часта паміралі, Марцэлі зрабіўся вельмі набожным, толькі ў Богу і святасці бачыў паратунак сям'і і яе будучыні. З гэтым звязаны якраз той самы выпадак, які прымусіў яго з сям'ёй перабрацца з дабротнага бацькоўскага клейнікаўскага дома ў менш зручны драўляны дом у Скоках. Аднойчы ў Клейніках яму прысніўся сон, што як быццам бы ён там памёр. Будучы вельмі ўражлівым, ён не стаў марудзіць ні дня, сабраў свае пажыткі і з усёй сям'ёю пераехаў у Скокі ў стары драўляны дом, што стаяў на ўзвышшы, дзе сёння яшчэ стаіць цагляная калона і месца мае назву Рахвал.

Марцэлі апроч калоны на Рахвале і капліцы Марыі Егіпецкай пабудаваў у Скоках касцёл разам з сямейнай крыптай; і, нарэшце, ён жа пабудаваў цудоўны палац у Скоках, які стаіць і сёння, у якім, як ён меркаваў, будуць жыць разам тры сям'і яго сыноў – так Марцэлі паважаў сямейныя адносіны, што не пагаджаўся з рэальнасцю самога жыцця. Гэты палац у Скоках, які цудам застаў не разбураны, – сёння адзіны рэальны адбітак каля Берасця і ў самім уласна Берасці той ужо далёкай і зусім сёння не зразумелай нам эпохі канца XVIII стагоддзя. Трэба быць зусім абыякавым, каб не паважаць гэтага славутага нашага земляка, які лічыў сябе берасцейцам.

Палац у Скоках – адметная спадчына Нямцэвічаў. Ён перажыў адну татальную эвакуацыю, два поўныя рабаванні, павінен быў быць узарваны, але ўстаяў. Ён сведка шматлікіх падзей, у тым ліку і сусветных. Яго муры шмат чаго памятаюць. Сёння палац аднаўляецца пасля працяглага маўклівага разбурэння. Дай Божа, каб гэта адбылося! У гісторыі роду Нямцэвічаў палац заслугоўвае таго, каб пра яго сказаць асобнае слова.

У той час, калі Клейнікі «не прынялі» Марцэля, бацьку знакамітага Юльяна, яму прыйшла ў галаву апантаная ідэя – пабудаваць мураваны палац у Скоках для трох сыноў і іх сем'яў. Дагэтуль Нямцэвічы жылі ў дабротных драўляных дамах з лістоўніцы. Гэтую ідэю Марцэлій хутчэй за ўсё пераняў у Яна Флемінга, з якім сябраваў і шмат чаму вучыўся, праўдзівей будзе так: той Марцэлія навучаў. У гэты час Я. Флемінг імкліва перабудоўваў Тэрэспаль каля Берасця – сваю рэзідэнцыю – у каменны еўрапейскі горад і панавёз туды шмат майстроў з Галандыі і Нямеччыны, так што не было патрэбы ехаць па вопыт далёка кудысьці – усё было пад бокам. Той жа Я.Флемінг навучаў мясцовых уладароў і лепш гаспадарыць на сваіх землях, а таксама навучыў сплаўляць сваё збожжа і іншыя здабыткі па Заходнім Бугу і Вісле да Гданьска з паваротам назад. Таму новыя рачныя судны ня толькі цяпер хадзілі ў адзін бок, як гэта яшчэ рабіў бацька Марцэля Аляксандр з Клейнікаў, але маглі з закупленым на вырučаныя грошы таварам у Гданьску вяртацца дамоў, што, безумоўна, спрыяла павялічэнню дабрабыту заможных берасцейскіх людзей. Вось такія абставіны складаліся ў другой палове XVIII стагоддзя ў Берасцейскім ваяводстве, а таму задума Марцэля была цалкам абгрунтаванай. На жаль, не засталося сведчання, хто ж спраектаваў палац у Скоках і хто канкрэтна яго пабудаваў, але праўдападобным будзе тое, што Марцэлі пры гэтым мог быць найгалоўнейшым архітэктарам усёй сваёй задумы, таму што вельмі ўсё адпавядала ў пабудаваным палацы яго настойліваму і набожнаму характару.

Будаўніцтва палаца пачалося дзесьці хутка пасля ад'езду Юльяна ў кадэцкую школу ў Варшаве ў 1770 годзе. Як Юльян сам піша, калі ён два разы за сямігадовы перыяд навучання ў Варшаве вяртаўся дамоў на вакацыі, то заўважаў кожны раз «там вялікія змены», і далей дакладна тлумачыць: «Заклаў мой бацька ў Скоках

частку новага каменнага палаца». Хутчэй за ўсё палац быў пабудаваны прыкладна пасля 1777 года, таму што на акварэлі, якую апублікаваў пазней А.Краўшар (верагодна, гэта твор самога ж Юльяна, бо ён меў ахвоту да малявання), палац з вежамі-алькежамі і касцёлам ужо пабудаваны. Юльян быў сведкам будаўніцтва палаца і пакінуў пра гэта лаканічную і трохі іранічную характарыстыку. Насамрэч, нарадзіцца ў гэтым палацы, як паведамляюць памылкова некаторыя айчынныя крыніцы, наш знакаміты суайчыннік Юльян У.Нямцэвіч, вядома, не мог, але спыняцца тут спыняўся, і не адзін раз. У мясцовых жыхароў ёсць меркаванне на гэты конт, што Юльян, калі прыязджаў у Скокі, займаў вуглавы пакой знізу ў левым крыле будынка, а іх далёкі сваяк, Тадэвуш Касцюшка, – справа ў скляпенным пакойчыку каля залы для прыёму гасцей, «згодна традыцыі», як заўважае апошні гаспадар палаца Станіслаў Нямцэвіч. Прымем гэтае ўдакладненне на веру.

Першае поўнае абрабаванне палаца адбылося ў час Касцюшкаўскага паўстання ў 1794 годзе, пра гэта сведчыць сам Юльян, які атрымаў гэтую вестку ад свайго дваюраднага брата Станіслава, будучага Гродзенскага губернатара. Юльян называе і выканаўцу абрабавання, а менавіта – маскоўскага генерала Дэрфельда і яго падначаленых, якія з палаца і маёнтка забралі ўсё, нават не пашкадавалі маленькага сабачку ягонай сястрычкі і паднялі яго на казацкія дзіды. Толькі што не спалілі палац.

Унук Марцэлія Тадэвуш пад уплывам тагачасных стыляў у будаўніцтве надумаў змяніць вонкавы выгляд палаца і асабліва ўнутраны інтэр'ер, а таксама пашырыць цесныя пакоі. Гэта больш закранула партэр палаца, але Тадэвуш не спыніўся на тым і зраўняў з дахам бакавыя вежы-алькежы, чым парушыў і вонкавы выгляд палаца. На шчасце, даследчык Аляксандр Краўшар дзесьці ў 1904 годзе, убачыўшы ў Скоках акварэль Юльяна, зрабіў яе рэпрадукцыю, і такім чынам даў магчымасць у наш час убачыць палац у спрадвечным выглядзе. Такія вось здараюцца ў гісторыі дробязі, якія праз стагоддзі выпраменьваюць ужо зусім іншы пазітыў.

Больш дакладную архітэктурную характарыстыку палаца пазычым у беларускага даследчыка Анатоля Кулагіна: «Палац мае характэрную для архітэктуры барока пластычную аб'ёмна-

прасторавую кампазіцыю <...> Асноўны аб'ём будынка накрыты высокім «польскім» дахам з заломам і дзвюма люкарнямі. Цэнтральныя ўваходы з галоўнага і паркавага фасадаў акцэнтраваныя вынаснымі тэрасамі на слупах з ажурнымі барочнымі парэнчамі. Плоскасна трактаваныя сцены дома маюць рэгулярны 8-восевы рытм прамавугольных вокнаў. <...>Анфіладная планіроўка дома таксама падпарадкавана строгай люстэркавай сіметрыі. Цэнтральнае месца ў ёй адведзена вестыбюлю і вялікай зале з выхадам у парк. Зала на другім паверсе прызначалася для святкаванняў, урачыстасцяў, танцаў і мела антрэсоль для музыкаў; па баках знаходзіліся дзве вялікія гасцёўні. Такая ўнутраная арганізацыя палаца ў значнай меры абумоўлівалася рытуалам парадных цырымоній і стылем шляхецкага жыцця. Дзве бакавыя вежыалькежы прызначаліся пад скарбніцу і сховішча.»

Тры генерацыі Нямцэвічаў – Ян (1762-1821), Тадэвуш (1793-1839) і Ян (1830-1900), не лічачы будаўніка палаца Марцэлія (1727?-1802), якія пражылі ў палацы ўсё сваё жыццё ад нараджэння да смерці, толькі паляпшалі яго дабрабыт. Дзякуючы ім, палац не закранулі два вызваленчыя паўстанні ў Беларусі – 1830 і 1863 гадоў, як і французская вайна 1812 года.

Безумоўна, скокаўскі палац да свайго заняпаду ў час Першай сусветнай вайны, а менавіта да жніўня 1915 года, быў прэзентабельным месцам. Гасцямі яго маглі быць вядомыя асобы Расійскай імперыі і замежжа, на жаль, такой статыстыкі ніхто не вёў. На той час ужо была магчымасць рабіць фотаздымкі. Па здымках, якія захаваліся ў Францыі ў сямейным архіве Нямцэвічаў, ёсць падставы меркаваць пра некаторыя ўнутраныя інтэр'еры палаца і ўбачыць фрагменты парка, які прылягае да яго. Гэтыя здымкі прыслала ў Скокі апошняя з Нямцэвічаў, народжаная ў палацы, – Тэрэса Вярыха. Дзякуючы ёй мы маем магчымасць трохі праціснуцца ў вузенькую гістарычную шчылінку і зазірнуць у скокаўскі палац праз больш як стогадовы прамежак часу, каб убачыць прыгожае і годнае месца, якім можам захапляцца і ганарыцца.

У вялікай гасцёўні партэра, шкляныя дзверы якога праводзілі да парка, сямейныя партрэты скокаўскай галерэі. Станіслаў, апошні гаспадар скокаўскага палаца, вядома, іх яшчэ бачыў і пералічвае ў сваіх успамінах па памяці: «Самуіл у зброі

на каленях моліцца перад крыжам за выратаванне ад шведскага нашэсця; Андрэй у чырвоным кантушы; Марцэлій; Станіслаў у генеральскім мундзіры; Юльян; Ян, маршалак берасцейскі; Ядвіга з Сухадольскіх, жонка Марцэлія; партрэт продка жонкі Яна Соф'і ў мундзіры гвардыі.» Сапраўды, ён пералічвае іх так, як успамінае, а не так, як яны віселі ў зале на фотаздымку. Станіслаў таксама падкрэслівае, што ў салонах быў цудоўны мазаічны паркет, які, праўда, хоць і ў дрэнным стане, але захаваўся дасюль. Ён удакладняе таксама, што «са сталовай залы шкляныя дзверы выводзілі прама на тэрасу за домам, з якой некалькі каменных прыступак вялі ў парк». Далей Станіслаў працягвае: «Непасрэдна за тэрасай была вялікая клумба з ружамі і сцежка паміж грабавымі шпалерамі ў парку».

Ніжэй яшчэ вернемся да парка, а цяпер заглянем у дзве гасцёўні на другім паверсе палаца. Гэтыя салоны былі меншыя памерам, чым у партэры, але да аднаго з іх (праглядваецца праз гардзіны) прымыкае невялікае памяшканне, яго добра можна разглядзець на адным са здымкаў. Менавіта гэта і ёсць «скарбніца». У гэтай «скарбніцы» да 1915 года захоўваўся архіў і іншыя рэліквіі Нямцэвічаў, якія сёння, безумоўна, мелі б дзяржаўную каштоўнасць.

На фотаздымках відаць, што ў залах другога паверху маглі знаходзіцца таксама каштоўныя карціны, якія Станіслаў пералічвае: «...некалькі партрэтаў такіх майстроў, як Фры Барталамеа «Маці Божая з Панам Ісусам у ружах», два – Тэнэрса, Бачыарэллі і адзін ван Дэйка. Даволі шмат было крышталю, апраўленага ў срэбра і старую бронзу.» Вельмі праўдападобна, што на адным са здымкаў салона другога паверху праглядваецца палатно Фры Барталамеа, нешта можна ўбачыць і на іншых. Ці ёсць шанец сёння штосьці знайсці з усяго гэтага багацця? Некаторыя публікацыі паказваюць, што ёсць. Здымкі, прысланыя з Францыі Тэрэсай Вярыхай, без сумнення з'яўляюцца добрай падставай аднавіць дух інтэр'ераў палаца.

Вернемся да парку, які быў яшчэ спраектаваны Марцэлем, а потым яго нашчадкамі даводзіўся да пэўнага ўзроўню. Гэта быў англійскі парк, як падкрэслівае апошні гаспадар скокаўскай сядзібы. Ён складаўся з лужкоў, атачоных алеямі з ясеня. З боку

ад палаца да цэнтральнай алеі парку праводзіла спачатку нізкая грабавая шпалера, якая далей высокаю ступенькай узнімалася да сямі метраў у вышыню. Гэта была цудоўная і рэдкая шпалера, якая выводзіла да ліпавай алеі, а потым – да лугоў ракі Лясной і яе старых заток. За выключэннем галоўнай дарожкі, былі яшчэ два вузкія бакавыя грабавыя «тунэлі», сляды якіх прасочваюцца і сёння, таму што больш чым стогадовыя грабы, на шчасце, нікому і ні для чаго не спатрэбіліся. Выгляду, вядома, таго яны ўжо не маюць, але з'яўляюцца роднымі, паркавымі. Прыкладна ў сярэдзіне парку, трохі далей за грабавай шпалерай, стаяла велічэзная яліна, яна трохі праглядваецца на адным здымку. Як успамінае Станіслаў, гэтая яліна насамрэч яшчэ заставалася ад той старадаўняй пушчы, якая з даўніх часоў падступала да самага Берасця. Яліна была такая тоўстая, што яе з дапамогаю рамянёў не маглі абняць двое мужыкоў. Але пасля апошняй вайны тыя ж мужыкі зрабілі тое, што робяць усе мужыкі. Спатрэбілася праз раку Лясную кладка, каб хутчэй было дабірацца да горада. Справа патрэбная, і навошта доўга меркаваць, калі такая дзівосная яліна пад бокам?! Паноў ужо няма, кожны стаў панам, узялі тую яліну і звалілі, дзедаўскім спосабам перапалавінілі – і кладка гатова. Нядоўгім быў век у той кладкі з векавой яліны, але сувязь з вечнасцю, якую трымала яна ў скокаўскім парку з асяроддзем, была страчана, на жаль, назаўсёды.

Грабавыя шпалеры былі аддзелены лужкамі ад двух ясеневых алей, што цягнуліся вакол парка. Бядой парка былі велізарныя ядомыя французкія ўліткі, якіх разам з труфелямі, што раслі ў зямлі за касцёлам, завёз з Францыі нехта з продкаў Нямцэвічаў. Асабліва пасля дажджу, як успамінае Станіслаў, у парку немагчыма было прайсці, каб не растаптаць улітку. Збоку палаца стаяў вельмі стары і тоўсты ціс, якому мясцовы люд прыпісваў лекавыя ўласцівасці. Там жа збоку стаяла высокая альтанка. Пры парадным фасадзе палаца гасцей сустракала таксама вялізная круглая клумба з ружамі. Яе з усіх бакоў акружала ездавая дарога, сёння, дарэчы, без усялякага сэнсу заасфальтаваная. Па баках палаца стаялі афіцына з кухняй і канюшня з калодзежам. Вокны афіцыны выходзілі на парадны пад'езд і ноччу яго асвятлялі. Каля пад'езда па баках прытуліліся да калонаў дзве чыгунныя літыя лаўкі. Насупраць кухні за афіцынаю

справа ўзвышаўся даўні драўляны лямус на каменных слупах. Нават немцы ў 1916 годзе яго пашкадавалі і накрылі зверху новай гонтай. За ўяздной брамаю ішла да касцёла старая ліпавая алея, якая ў апошнія гады бязлітасна амаль поўнасцю знішчана. Ліпы перасякалі алею надвіслянскіх тапаляў, якія яшчэ некалькі гадоў таму таксама ўпрыгожвалі сваёй велічнасцю стары парк у Скоках і нікому і нічому не пагражалі, а патрабавалі звычайнага гаспадарскага догляду замест гвалтоўнага знішчэння.

Вернемся на хвіліну да палаца. Як піша Юльян, сцены палаца ў партэры маюць таўшчыню ў два локці, гэта азначае: маюць амаль метровай таўшчыні муры, а пад усім палацам прасціраецца велізарны падвал адзіным памяшканнем са скляпенным зводам, апіраючыся пасярэдзіне на магутны каменны слуп, чым нагадвае старадаўнюю рыцарскую залу. Гэтыя магутныя каменныя сутарэнні трымаюць і сёння на сабе гістарычны скокаўскі палац.

Больш як стогадовае размеранае жыццё палаца абвальна разбурыла Першая сусветная вайна, а менавіта татальная эвакуацыя ў дачыненні да заходніх беларускіх зямель. Цяжка ўявіць сабе той жудасны жнівень 1915 года, калі літаральна ўсё жывое і нежывое зрушылася ў імгненне вока з месца і рушыла на ўсход.

Больш як стогадовае размеранае жыццё палаца абвальна разбурыла Першая сусветная вайна, а менавіта татальная эвакуацыя ў дачыненні да заходніх беларускіх зямель. Цяжка ўявіць сабе той жудасны жнівень 1915 года, калі літаральна ўсё жывое і нежывое зрушылася ў імгненне вока з месца і рушыла на ўсход.

Палац у Скоках, як і ўсё ладнае кругом, павінны былі ўзарваць паводле найвышэйшага загаду, як гэта зрабілі са шмат якімі іншымі капітальнымі збудаваннямі ў Берасці. Але тут праявіла свой энергічны і самаадданы характар жонка Яна-малодшага Нямцэвіча Соф'я. Гэта па сутнасці яна ў 1915 годзе ўратавала палац і рэшткі сямейных рарытэтаў ад поўнага знішчэння. Палац быў ужо зусім спустошаны, усё, што можна было пакласці на фурманкі, ужо ад'ехала ад Скокаў і ўлілося ў бясконцыя патокі бежанцаў на ўсход. Нямцэвічы жа заставаліся ў палацы да апошняй хвіліны. Ужо немцы ўвайшлі ў крэпасць, і толькі тады, калі камандзір казацкай дывізіі, які знаходзіўся таксама ў

Скоках у палацы, даў ім слова афіцэрскага гонару, што «не будзе прыстасоўвацца да загадаў і палац не ўзарве», яны пакінулі сваё радзіннае гняздо ў Скоках і падаліся, верагодна, спачатку да сваіх сваякоў пад Кіеў, а потым у Ялту, дзе і застала іх рэвалюцыя ў Расіі. Абозы ж са скокаўскім скарбам, табун чыстакроўных англійскіх скакуноў, людзі рухаліся сваім накірункам пад Калугу, дзе іх ужо напаткала рэвалюцыя і грамадзянская вайна ў Расіі. У Скоках нікога не засталося. Гэта быў самы спусташальны час для скокаўскага палаца за ўсю яго гісторыю існавання, пасля чаго ён ужо больш як за сто гадоў не можа падняцца. Скокі, як і ўсё асяроддзе, апусціліся ў смяротную дрымоту. Праўда, адзін жывы сведка ўсё ж у Скоках заставаўся: гэта быў Касюк Міхась, у якога выпадкова альбо па волі лёсу зламаўся воз непадалёку ад Скокаў – у Чарнаўчыцах, і ён вырашыў павярнуць назад дамоў, дзе палічыў за лепшае застацца. Гэта быў адзіны мясцовы сведка ўсіх гістарычных падзей, якія пазней адбыліся ў Скоках.

Вядома, што пад час той вайны скокаўскі палац не надоўга быў пакінуты людзьмі, таму што хутка быў аблюбаваны пад галоўную кватэру камандуючым Усходнім германскім фронтам, генералам-фельдмаршалам, прынцам Баварскім Леапольдам. Гэта вызначыла яго геапалітычную ролю, якую палац іграў з 3 снежаня 1917 года па 3 сакавіка 1918 года.

**Менавіта тут 15 снежня 1917 года ў адзінаццаць гадзінаў вечара паміж Германіяй і яе саюзнікамі з аднаго боку і ўжо Савецкай Расіяй з другога боку ў салоне другога паверху было падпісана перамір'е, якое фактычна афіцыйна спыняла баявыя дзеянні Першай сусветнай вайны на ўсходзе.** І адразу ў Берасці пачаліся інтэнсіўныя перамовы з бальшавікамі па заключэнні міру. Таму да сакавіка 1918 года ў скокаўскім палацы перабывалі ўсе найважнейшыя VIP-асобы тых лёсавызначальных перамоў.

Пасля рэвалюцыі 1918 года ў Германіі і ад'езду са Скокаў прынца Баварскага (да гонару прынца трэба адзначыць, што ён спрабаваў знайсці каго-небудзь з Нямцэвічаў, каб перадаць ім палац у адпаведным стане, але гэта было немагчыма), адступаючы, нямецкія войскі палац абрабавалі дашчэнту. Як вярнуўся гаспадар палаца Ян У. Нямцэвіч восенню 1918 года ў Скокі, там практычна не засталося, апроч сцен, нічога.

Новае адраджэнне палаца пачалося адразу пасля вайны 1920 года, якая віхорам зноў пранеслася па зусім збедненай і занядбанай зямлі. Новая польская ўлада выбірае Яна Ў.Нямцэвіча прэзідэнтам Берасця, і ён прыймаецца як за аднаўленне горада, так і палаца. Нечаканая смерць Яна ў 1933 годзе спыняе гэты ход падзеяў, і Скокаўскі маёнтак пераходзіць Станіславу Ў.Нямцэвічу, які ўзяў шлюб са сваёй дваюраднай сястрой Янінай У.Нямцэвіч, дачкой Яна, якая нарадзілася ў Скоках. Станіслаў быў апошні ўладар палаца з Нямцэвічаў, які, праўда, нарадзіўся і вырас не ў Скоках, а ў Барысаўшчызне пад Гародняй. У іх пасля сына Ежы Самуіла нарадзілася ў 1925 годзе ў Скоках дачка Марыя Тэрэса, якая была апошняй з Урсын Нямцэвічаў, якая мела яшчэ прамое дачыненне да нямцэвіцкага палаца. Потым у пачатку 1930-х гадоў у палацы здарылася нейкая бяда, і выгарэў дах, а Нямцэвічы пасля гэтага выпадку яшчэ да падзей 1939 года эміgравалі ў Францыю, спадзеючыся, што гэта будзе часовы выезд. Яны часова пакінулі палац у Скоках на родную сястру Яніны Соф'ю, якая была замужам за Альфрэдам Пілецкім, які ў 1939 годзе быў замардаваны ў Івацэвічах, па іншых звестках – у Катыні. Што здарылася з Соф'яй з Нямцэвічаў – невядома. Палац быў канфіскаваны савецкай уладай. У час апошняй вайны па нейкім толькі Богу вядомым супадзенні палац зноў уцалеў. Пасля вайны ў хуткім часе тут адкрылася ўжо новая савецкая школа, якая па сутнасці і выратавала палац ад разбурэння. Школа ў скокаўскім палацы была адначасна і жыллём для маладых сямейных настаўнікаў, так што з'яўленне на свет новых грамадзяў у палацы не скончылася на Нямцэвічах. У час канікулаў палац станавіўся летнікам для берасцейскіх піянераў. Таму шмат хлопцаў і дзяўчынак пасляваеннага пакалення з Берасця перабывала ў гэтым палацы.

Потым было прынята некае выключна неадпаведнае рашэнне ў 1980-х гадах: пабудаваць новую тыповую школу, не ўвязаўшы яе праект ніякім чынам з прыгожым, годным палацам, які даў жыццё гэтай школе. Адметны палац з вялікай гісторыяй апынуўся на задворках невыразнага тыповага будынка і сіратліва стаў чакаць сваей будучыні. Што тут трэба больш каментаваць. «Геніяльнае» вызначэнне палаца за чвэрць стагоддзя прывяло яго ў поўнае запусценне. Добра, што той Марцэлій усё будаваў без усялякіх камісій

«на выдатна» і будынак вытрываў і гэтае маўклівае разбурэнне. Трэба заўважыць, што ў 1990-х гадах усё ж была нейкая спроба аднавіць палац і адкрыць там музычную школу альбо музей, але спроба закончылася новым, на гэты раз апошнім рабаваннем, пасля чаго ў палацы не засталося ні дабротных вокнаў, ні арыгінальнай чыгуннай лесвіцы, якую, як кажуць, мясцовыя алкаголікі дзіка разламаўшы, здалі на металалом. Але, нягледзячы на гэта, ёсць надзея ўсё ж убачыць палац у першародным стане, таму што, паводле праекту, яму павінны вярнуць бакавыя вежы-алькежы, гэта будзе адпаведны выгляд палаца малога замку. Мы ўсе стаміліся гэтага чакаць! Хай гэта адбудзецца! Трэба хоць што-небудзь мець вечнае ў гэтым так часта разбуральным атачэнні. Гэтаму замачку ў Скоках сёння спаўняецца 230 гадоў, і ён непасрэдны сведка нашай роднай, айчыннай гісторыі, а не пазычаных фактаў. Хай і далей нам усім: і тым, хто жыве тут, і тым, хто будзе прыязджаць да яго, – Скокаўскі адроджаны палац нясе гістарычную асалоду пазнання і ўсведамлення асабістай годнасці.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Niemcewicz U. J. Pamietniki czasow moich. Warszawa, 1957.
2. Niemcewicz U. S. Moim wnukom. Manuskrypt, 1979.
3. Федарук А. Т. Старинные усадьбы Берестейщины / А. Т. Федарук. –Минск, 2004. – 574 с. : ил.
4. Prinz Leopold von Bayern. Kriegstagebuch //Bayerisches Hauptstaatsarchiv.
5. Гладыщук А.А. Перемирие в Скоках / А.А. Гладыщук // Вечерний Брест. – 2007. – 14 декабря (№ 100). – С. 5.
6. Гладыщук А.А. Замочек в Скоках / А.А. Гладыщук // Брестская газета. – 2008. – 11-17 января (№ 2). – С. 25.
7. Гладышчук А.А. Нямцэвічы. Сапраўдныя гісторыі. Мінск (у друку).